-2018. - 7 апреля (№ 28). - с. 10.

Полесская правда

Ракурс

Конкурс

# Асяродак нацыянальнай культуры

**Па выніках абласнога тура XXVI рэспубліканскага конкурсу Дамашыцкая сельская бібліятэка сямейнага чытання была адзначана Лістом падзякі – за шматгадовую і плённую працу па прыцягненні да чытання дзяцей і падлеткаў пасродкам актыўнай культурна-асветніцкай дзейнасці, выхаванне ў маладога пакалення пачуццяў патрыятызму і гонару за сваю Радзіму праз папулярызацыю лепшых узораў нацыянальнай і сусветнай літаратуры.**



Дамашыцкая сельская бібліятэка існуе ўжо 63 гады. За гэты час яна прайшла дасканалы шлях у сваім развіцці, мае шмат цікавых набыткаў, дасягненняў і традыцый, унесла вялікі ўклад у справу фарміравання культуры сваёй мясцовасці.

У 2006 годзе ў рамках мэтавай праграмы «Свет отчего дома» Дамашыцкая сельская бібліятэка атрымала статус бібліятэкі сямейнага чытання. Для 450 чытачоў бібліятэка з'яўляецца інфармацыйным, адукацыйным і культурна-асветніцкім цэнтрам вёскі. Штогод у яе сценах праходзіць больш за 70 мерапрыемстваў, акрамя традыцыйных форм работы, актыўна выкарыстоўваюцца сучасныя – бібліятэчныя дэсанты, фэсты, акцыі, трэнінгі, дзелавыя гульні і іншыя. Штогод бібліятэка прымае ўдзел у абласным месячніку папулярызацыі нацыянальнай мастацкай літаратуры «Маіх радкоў няма без Беларусі», тыднях папулярызацыі творчасці Я. Янішчыц «Янішчыцкі лістапад», ваеннай кнігі, прафілактыкі наркаманіі, дзіцячай і юнацкай кнігі, у раённых літаратурных святах.

Асаблівая ўвага надаецца ў бібліятэцы рабоце з падрастаючым пакаленнем. Для таго, каб выхаваць любоў да прыроды і прыгажосці навакольнага свету, пры бібліятэцы дзейнічае аматарскае аб'яднанне для дзяцей «Экос» экалагічнага накірунку.

Амаль 50 год нязменнай гаспадыняй бібліятэкі з'яўляецца Сафія Іванаўна Селюжыцкая **(на здымку)**, якая працуе тут з верасня 1969 года. Яна заўсёды ўважлівая да сваіх чытачоў, прафесіянал, якога пашукаць, ёй уласцівы дабрыня і жаночае абаянне. Дзякуючы ёй наладжана цесная сувязь бібліятэкі са школай і сельскім Домам культуры. Неаднаразова Сафія Іванаўна была ўзнагароджана за сваю працу граматамі рознага кшталту.

**Іна УРБАНОВІЧ.**
**Фота аўтара.**

Год малой радзімы